● Не зусім звыклае для мясцовай улады пытанне -- выкананне Закона "Аб мовах" у сельскагаспадарчых прадпрыемствах раёна -- абмеркаваў Мастоўскі райвыканкам. Адзначалася, што практычна ва ўсіх калгасах і саўгасах справаводства, дзелавая перапіска вядуцца на рускай мове. Амаль паўсюдна не гучыць дзяржаўная мова і пад час правядзення вытворчых нарад. Рэкамендавана кіраўнікам прадпрыемстваў да канца года паступова перавесці справаводства, службовую перапіску, рэкламна-інфармацыйныя і шыльдава-даведніцкія матэрыялы на беларускую мову. А сельскім Саветам даручана ўсе пытанні поўнага і якаснага ажыццяўлення Закона "Аб мовах" перыядычна аналізаваць на сваіх пасяджэннях.

● Повышение цен на крепкие напитки вызвало не только рост активности предпринимателей, предлагающих покупателям аналогичный, но более дешевый заграничный продукт. Еще круче стали действовать крутые парни из криминального мира, участились кражи "огненной" жидкости. Вот и недавно из одного из гаражей на окраине областного центра уплыли в неизвестном направлении 53 ящика спирта. Самое интересное, пожалуй, то, что потерпевший "предприниматель" -- студент. А в деревне Евлаши Щучинского района пострадал из-за повышения цен на водку... тамошний фельдшерско-акушерский пункт, откуда были выкрадены все лечебные спиртосодержащие настойки.

По сообщениям "Р", Белинформ, ИТАР--ТАСС, Интерфакс, РИД, БелаПАН.

Курсы валют в коммерческих банках Минска на утро 19 сентября 1994 г.

Наименование банка	$ 1	$ 2	DM 1	DM 2	Росс. рубль 1	Росс. рубль 2	Тел.
КОМПЛЕКС	3807*	3920	2444*	2535	1.50	1.64	067
БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК	3000*	4000	2330*	2585	1.40	1.54	267-022
БЕЛАРУСБАНК	4140*	4048*	2576*	2929*	1.39*	1.65**	239-250
БЕЛБИЗНЕСБАНК (ГЛ.ОПЕРАЦ.УПРАВ.)	3750	4000	2400	2600	1.25	1.45	349-893 067
НАРОДНЫЙ БАНК	3820*	3910*	2450*	2525	1.52	1.67	238-610
ПРОФБАНК	---	---	---	---	1.55	1.70	239-344
СБЕРБАНК	3750*	4050	2390*	2600	1.35*	1.45	067
ОЛИМП	3900	4080	2500	2615	1.50	1.69	508-556
СЕВЕРО-ЗАПАД	3820*	3900	2400*	2550	1.50	1.70	268-544
ПРИОРБАНК	4000	4100	2580	2650	1.30	1.60	690-964
ДУКАТ	3700*	3950	2380*	2560	1.40	---	201-063
СП ГУБИСС РЕСУРС	3650	3950	2250	2550	1.50	1.70	769-177
(за росс. рубль)	2340	2495					
МАГНАТБАНК	---	---	---	---	1.60	1.96**	207-625
ФИН.КОМП.СОЛИД	3810	3950	2460	2554	1.49	1.58	067 202-993
СЕРВИС БАНК	3735	3850	2406	2480	1.50	1.65	067
МИЛАВИЦА филиал АКБ ДУКАТ	4300**	4500**	2350	2450	1.40	1.50	372-825
ф.п."Интерконтиненталь-СКВ"	3300	3500	2090	2270	---	---	
БЕЛИНВЕСТБАНК	3650*	3950*	2300*	2500	1.30	1.50	
филиал N1 банка ОЛИМП	4200**	4600**	2700**	3000**	1.30**	1.60**	291-646
МИНСКИЙ ТРАНЗИТНЫЙ БАНК	3850	4000	2490	2585	----	----	
"СОТРУДНИЧЕСТВО" (отделение БББ)	4200**	4620**	2700**	3000**	1.60**	1.75**	547-891
НАЦИОНАЛЬНЫЙ БАНК (официальный курс)	4515.00		2920.05		1.98		
ЦЕНТРОБАНК РОССИИ	2301.00		1488.16		10 бел.руб. 6.03		

1 -- Покупка 2 -- Продажа
* Возможна операция за наличный и безналичный расчет
** Операция проводится только по безналичному расчету и по чековой книжке
В течение дня курсы могут меняться

"Агентство Гревцова"



Краю наш Нёманскі...

(Заканчэнне. Пачатак на с.1)

Менавіта ў сямідзесятыя гады Гродзеншчына набыла агульнасаюзную вядомасць як край высокаінтэнсіўнай сельскай гаспадаркі, эфектыўнай прамысловасці, развітай сацыяльнай інфраструктуры. Менавіта пад час "заганнага" партыйнага кіраўніцтва -- падабаецца гэта каму ці не -- стварыўся магутны эканамічны патэнцыял вобласці, што і дагэтуль не зруйнаваны, выхоўваўся адмысловы кадравы корпус, які ў большасці сваёй і ў новых варунках не разгубіўся. Мінулага, зразумела, не вернеш, хада часу -- што таксама камусьці не падабаецца -- незваротная, таму і кадры нашы дзейнічаюць цяпер іншымі метадамі.

-- Аднак ці не разгубленасцю выкліканы ваш ліст да прэм'ер-міністра з просьбай зменшыць вобласці пастаўкі збожжа ў дзяржрэсурсы на 80 тысяч тон?

-- За гэтым вымушаным зваротам да ўрада стаіць перш за ўсё цвярозая ацэнка сітуацыі, што склалася ў сельскай гаспадарцы Гродзеншчыны ў выніку жорсткай засухі. Яна не дазволіла хлебаробам атрымаць чаканы -- не менш 40 цэнтнераў з гектара -- ураджай. Нягледзячы на тое, што і ў гэтых, надзвычай неспрыяльных умовах сельскія працаўнікі здолелі забяспечыць самую высокую ўраджайнасць у рэспубліцы -- больш за 29 цэнтнераў з гектара, валавы збор зерня паменшыўся ў параўнанні з леташнім на 400 тысяч тон /28,7 працэнта/. Разлікі паказваюць, што забяспечанасць жывёлы канцэнтраванымі кармамі складзе толькі 29,6 працэнта ад патрэбнага. Няма сена, бо травы выгаралі, нельга спадзявацца і на бульбу, накопваюць яе сёлета ўдвая менш мінулагодняга. Вось чаму -- каб прадухіліць зніжэнне пагалоўя жывёлы і яе прадукцыйнасці, захаваць неабходныя аб'ёмы продажу насельніцтву мяса-малочнай прадукцыі, мне прыйшлося звярнуцца да прэм'ер-міністра.

-- З надзеяй, выбачайце, што Гродзеншчына, параўнальная заможнасць якой заўсёды выклікала пэўную зайздрасць у рэспубліцы, зноў, маўляў, паспрабуе ўтрымацца на паверхні за кошт дзяржавы?

-- Наша вобласць ніколі не была ўтрыманкай, не будзе ёю і надалей. Што тычыцца зерня, асновы ўстойлівага развіцця галоўнай галіны эканомікі Гродзеншчыны -- сельскай гаспадаркі, то тут распрацаваны і ўжо ажыццяўляюцца праграмы, якія дазволяць пазбавіцца залежнасці ад жытніц былога Саюза. Маецца на ўвазе не фуражнае зерне, а пшаніца харчовых гатункаў. Сёлета закладваецца такая структура азімых палеткаў, назапашваецца насенне адпаведных гатункаў, у тым ліку і гродзенскай селекцыі, каб у жніво наступнага года атрымаць каля ста тысяч тон высакаякаснай пшаніцы. Улічваючы, што патрэбна яе харчовай прамысловасці 60 тысяч тон, то, напэўна, і гандляваць пшанічкай здолеем. З не толькі кармавымі мэтамі пашыраны сёлета і пасевы рапсу -- атрыманае насенне будзе перапрацоўвацца на алей. Плануем у недалёкай будучыні пазбавіцца залежнасці ад замежных пастаўшчыкоў гэтага, пакуль што дэфіцытнага, прадукту. Ужо цяпер дзве з палovай тысячы тон рапсавага алею /2--3 літры на сярэднестатыстычнага жыхара вобласці ў год/ вырабляе спецыяльны цэх Слонімскай райаграпрамтэхнікі. Але гэтага недастаткова, таму будзем ствараць новыя вытворчасці.

-- Харчовая прамысловасць і раней, і цяпер -- ва ўмовах зніжэння вытворчасці сельгаспрадукцыі -- не ў стане справіцца з яе перапрацоўкай. Варта было калгасам і саўгасам павялічыць летась пастаўкі цукровых буракоў -- і Скідальскі цукровы камбінат спасаваў...

-- А ўявіце, што будзе, калі вытворчасць цукровых буракоў на Гродзеншчыне дасягне ў бліжэйшай перспектыве, як мы плануем, мільёна тон. Ніякая рэканструкцыя Скідальскага камбіната тут не дапаможа. Выйсце -- будаўніцтва ў вобласці яшчэ аднаго цукровага прадпрыемства, у Зэльве, на што даў згоду папярэдні ўрад. Калі цяперашні Кабінет міністраў не адмовіцца ад гэтага рашэння і падтрымае нас фінансамі, то Гродзеншчына не толькі сябе забяспечыць цукрам, але возьме на ўтрыманне яшчэ адну вобласць -- напрыклад, Магілёўскую ці Гомельскую. Карыстаючыся дадзенай "Рэспублікай" магчымасцю, хацеў бы з яе старонак звярнуцца да ўрада і за дапамогай ў будаўніцтве Навагрудскага лікёра-гарэлачнага завода. Будаўніцтва, завяршэнне якога плануецца на трэці квартал 1995 года, ідзе вельмі цяжка. А завод гэты, як і аналагічнае, праўда, меншай магутнасці прадпрыемства, што ўзводзіцца за кошт мясцовых сродкаў у Малым Мажэйкаве, надзвычай важны з фінансавага пункту гледжання: акцызны падатак з гэтай спецыфічнай вытворчасці цалкам застаецца ў абласным бюджэце. Атрыманыя такім чынам дадатковыя сродкі маглі б пайсці на развіццё прамысловасці па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі.

-- На павелічэнне магутнасцей дзейнічаючых дзяржаўных прадпрыемстваў?

-- Не, гэты шлях, за некаторымі выключэннямі, можна лічыць бесперспектыўным. А вось цэх па вытворчасці дзіцячага харчавання, будаўніцтва якога распачата ў эксперыментальнай базе "Руткевічы" Шчучынскага раёна, мае рынычныя перспектывы. Яго праектныя магутнасці -- 10 мільёнаў умоўных слоікаў у год -- разлічаны на патрэбы не толькі нашай вобласці. На жаль, і тут будаўніцтва сутыкаецца з вялікімі цяжкасцямі, выкліканымі недахопам сродкаў. Аднак спыняць яго, нягледзячы ні на што, нельга, бо ўжо паступіла італьянскае абсталяванне. Дарэчы, намаганні ўсёй вобласці зараз скіраваны на стварэнне сучасных цэхаў па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі непасрэдна на месцах яе вытворчасці -- у калгасах і саўгасах. А каб пераадолець непазбежныя фінансавыя цяжкасці, аб'ядноўваем дзеля гэтай мэты сродкі сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў.

Прыклады такога плённага супрацоўніцтва ўжо ёсць. Гродзенскі завод зборнага жалезабетону N 10 разам з адной з гаспадарак Ваўкавыскага раёна стварыў сумеснае прадпрыемства па вырабу прадуктаў харчавання. І гаспадарцы карысць, і рабочыя завода маюць магчымасць купляць прадукты без гандлёвых накрутак. І надалей будзем дзейнічаць у гэтым напрамку. Тут, нягледзячы на пэўныя набыткі, яшчэ шмат нявыкарыстаных рэзерваў. Тыя ж харчовыя міні-вытворчасці, якія ўжо існуюць у шэрагу калгасаў і саўгасаў, змаглі б пераадолець сваю пэўную саматужнасць, вырвацца з ціскоў абмежаванага рынку, калі б гаспадаркі больш смела ішлі на стварэнне сумесных прадпрыемстваў з замежнымі фірмамі. Па той бок мяжы, наколькі мне вядома, выказваюць схільнасць да супольнай работы з гродзенцамі. Аблвыканкам, раённыя ўлады, у сваю чаргу, таксама зацікаўлены ў гэтым, бо такія высокатэхналагічныя прадпрыемствы здольны выпускаць /прыклады ўжо ёсць/ вельмі якасную прадукцыю. З ёй, калі пашырыць маштабы вытворчасці, можна ўпэўнена выходзіць на Захад, атрымліваць цвёрдую валюту, патрэбную для аплаты энергарэсурсаў. Ды і на расійскі харчовы рынак, дзе цяпер пануюць вытворцы прадуктаў сумніцельнай якасці, дзверы перад намі адчыняцца.

Увогуле, пераарыентацыя нашай прамысловасці на патрэбы даволі высокапрадукцыйнай сельскай гаспадаркі Гродзеншчыны і яе насельніцтва, паглыбленая перапрацоўка мяса, малака, бульбы, садавіны, агародніны -- гэта той "канёк", што не ў казцы /занадта многа нас і раней спакушалі абяцаннямі дабрабыту і цяпер імі цешаць/, а наяве здольны вынесці нас з багны эканамічнага крызісу.



-- А ці не замкнёмся мы ў выніку ў сваёй шкарлупіне?

-- Вядома, не, бо такая структурная перабудова нашай прамысловасці не пашкодзіць і традыцыйным сувязям з Расіяй, а ўзаемаадносіны з нашымі заходнімі суседзямі стануць больш трывалымі і разнастайнымі. Напрыклад, дзелавымі, гандлёвымі партнёрамі Прынямоння ўжо цяпер становяцца Калінінградская і Яраслаўская вобласці, Краснадарскі і Стаўрапольскі краі... Выкарыстоўваючы сваё выгаднае геаграфічнае становішча, наладжваем усё больш плённыя стасункі з Беластокскім і Сувалкаўскім ваяводствамі Польшчы.

-- З суседзямі ніколі не варта сварыцца, а ў тым становішчы, у якім апынулася цяпер наша прамысловасць, і пагатоў...

-- Сапраўды, становішча -- горш не бывае. За студзень--ліпень індэкс аб'ёму прамысловай прадукцыі /у супастаўных цэнах/ да адпаведнага перыяду мінулага года склаў толькі 61,5 працэнта. Спад закрануў сваім чорным крылом літаральна кожную галіну прамысловасці, але найбольш -- хімічную. Менавіта яе прадпрыемствы -- вытворчыя аб'яднанні "Азот", "Хімвалакно", "Лакафарба" -- зрабілі самы важкі ўклад у агульнаабласное зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці. Да іх можна далучыць і гігант лёгкай прамысловасці -- прадзільна-ніткачнае аб'яднанне, дзе выпуск прадукцыі /з-за недахопу і дарагоўлі бавоўны/ скараціўся больш чым на 70 працэнтаў. На "Азоце" -- на 60 працэнтаў, але гэта амаль 530 мільярдаў рублёў, самая адчувальная страта для эканомікі вобласці.

Прычына вядомая -- запазычанасць расійскім газавікам. Ім, відаць, надакучылі міжурадавыя гульні ў розныя там "адзіныя зоны" і іншае, таму і прапануюць "Азоту" стварыць сумеснае акцыянернае таварыства. Спачатку расійскія партнёры патрабавалі кантрольны /51 працэнт/ пакет акцый, цяпер, калі пытанне аб акцыяніраванні "Азота" практычна вырашана, пагаджаюцца і на 30 працэнтаў.

Прыклад з "флагманам", як яго раней пыхліва называлі, хімічнай прамысловасці Беларусі паказвае, што прэзідэнцкая ідэя аб стварэнні беларуска-расійскіх карпарацый, якую і прамыслоўцы Гродзеншчыны падтрымліваюць, справа не такая простая, як здаецца. Перашкаджаюць распаўсюджаныя, усё яшчэ трывалыя надзеі на дабрачыннасць, якую быццам павінен праяўляць у адносінах да Беларусі яе "старэйшы брат". І забываецца, што "старэйшы брат" пакрысе становіцца капіталістам і пачынае паводзіць сябе адпаведным чынам: перш за ўсё -- асабістая выгада! Крыўдзіцца на гэта не варта, трэба, адкінуўшы эмоцыі, рабіць захады да узаемакарыснага супрацоўніцтва.

-- Аднак шэраг прадпрыемстваў, наколькі мне вядома, і ў гэтых варунках здолеў не толькі стабілізаваць, але і пачаў павялічваць вытворчасць прадукцыі.

-- Гэта гродзенскі "Радыёпрыбор", дзе ў сціслыя тэрміны асвоілі выпуск пераносных тэлевізараў. З кожным месяцам пашырае вытворчасць аўтобусаў Лідскі доследны завод "Нёман". Усё новыя і новыя тавары высокага класа прапануе спажыўцам вытворчае аб'яднанне "Гроднагандальмаш". У 2,9 раза павялічыўся ў вобласці выпуск медыцынскай тэхнікі, у 6,9 -- запасных частак да трактароў. Але ж агульная карціна спраў у прамысловасці -- несуцяшальная. Спад вытворчасці адмоўна адбіваецца і на абласным бюджэце, не дазваляе выдаткоўваць патрэбныя сродкі на развіццё сацыяльнай інфраструктуры, сферы культуры, што вельмі небяспечна, бо пагражае духоўным спусташэннем грамадства.

Таму настойліва і шукаем крыніцы для падсілкоўвання бюджэта, звярнуліся з гэтай нагоды і да турызму. Патэнцыял Гродзеншчыны, якую называюць у Еўропе краінай замкаў, у гэтым кірунку амаль што не выкарыстоўваўся. Прыклад паказаў Гродзенскі гарвыканкам, які ўсталяваў кантакты з міністэрствам турызму Францыі, з дапамогай тамтэйшых спецыялістаў стварыў у абласным цэнтры турыстычную арганізацыю еўрапейскага ўзору. Стажыравалася ў Францыі і загадчыца сектара турызму -- ёсць цяпер такі спецыяліст у аблвыканкаме. Французы вельмі зацікавіліся Прынямоннем, прапанавалі нам, у прыватнасці, супольна распрацаваць і давесці да ладу турысцкі маршрут "Па шляху Напалеона". Чым не валютная крынічка?

Нездарма кажуць, што з малых крыніц вялікая рака нараджаецца. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Домаш упэўнены, што Прынямонне зноў акрыяе. Як Нёман пасля чарговай засухі...

Фота Уладзіміра ГОФМАНА

Скандал

На долгую память о Беларуси

Леонас ДАУГЕЛА

В общежитии мединститута из комнаты, в которой живут пакистанские студенты, украли вещи. Всего на тысячу долларов. Общими усилиями милиции, работников общежития и студентов часть похищенного, в том числе ковер, была вскоре обнаружена в одной из комнат этажом ниже. Казалось бы, самый верный след для незамедлительного распутывания преступления и возвращения пострадавшим их добра. Но дело почему-то застопорилось...

-- Мыходили в Ленинский РОВД, -- рассказывает студент Халид. -- Сначала наше дело вел один следователь, потом другой, а теперь уже и не знаем кто... Самое, на наш взгляд, удивительное, что парень, в чьей комнате нашли часть наших вещей, ходит свободный, и где остальное -- не говорит! У нас создалось впечатление, что на все это просто махнули рукой: иностранцы, язык плохо знают, куда они пойдут, кому пожалуются?

Ну, махнуть-то не махнули: зарегистрированное и не раскрытое преступление нельзя так просто взять и списать. Мы тут у себя давно привыкли к равнодушию, а вот эти студенты прибыли из страны, где понятие правопорядка несколько иное...

-- Вы, когда домой поедете, обо всем этом рассказывать будете? -- спрашивал я.

-- Почему когда поедем? Мы уже сейчас письма обо всем пишем, -- отвечали пакистанцы.

Вот-вот! И пойдет гулять по свету еще одна нехорошая слава про нас...

Надо помнить, что эти студенты принадлежат к, скажем так, небедному классу; это люди, с которыми нам, возможно, еще придется иметь дело в плане межгосударственных отношений. Даже договоры подписывать. То-то нам будет легко договариваться!

-- Мы же не требуем невозможного, -- недоумевают пакистанцы. -- Мы платим многие тысячи долларов за обучение, у нас гродненская прописка: так почему закон нас не защищает?

Кстати, еще в прошлом году этих ребят ограбили в первый раз: две кожаные куртки унесли, то-се... До сих пор не найдено! Что прикажете о наших порядках и нравах думать людям, приехавшим из мест, где за кражу, говорят, могут и руку отрубить?

-- Нас в разных учебных заведениях Гродно уже около двухсот человек. Может, нам надо объединяться, самооборону создавать и самим себя защищать? -- спрашивал Халид.

Этого еще не хватало... Может, и вооружаться?..

Ну не можем мы жить без того, чтобы не влипнуть в скандал. Желательно международный...

"Гродненская неделя"

Самого сильного человека планеты -- гродненца Александра Курловича -- тренирует его брат Николай. Впереди -- новый чемпионат мира по тяжелой атлетике.

Фото Аркадия ПЕРЕХОДА



Ніва духоўнасці чакае сваіх руплiўцаў

Андрэй МАЙСЯЁНАК, намеснік старшыні камісіі па навуцы, адукацыі, культуры і выхаванні Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў

ГАРАДЗЕНШЧЫНА -- гэта 2 тысячы помнікаў гісторыі і культуры. Гэта край, з якім звязана жыццё і дзейнасць легендарных ваяроў Д.Гарадзенскага і К.Астрожскага, генералаў А.Антонава і В.Сакалоўскага. Тут -- вытокі беларуска-літоўскай дзяржаўнасці, матэрыялізаваныя дзейнасцю Міндоўга і Войшалка. Тут, у Наваградку, нарадзіўся наш сімвал справядлівасці, вольнасці і дзяржаўнасці -- "Пагоня", які стаў гербам Беларусі. Тут нараджаліся гістарычныя дзяржаўныя акты /Крэўская унія, Востраўскае пагадненне, Літоўскі статут і інш./. З-пад сцен наднёманскай Барыса-Глебскай царквы пад сцягам князя Вітаўта рушылі ў паход беларускія харугвы на лёсаносную бітву пад Грунвальдам. Наш край шчодра ўзгадаваў творчы і навуковы талент многіх выдатных дзеячаў еўрапейскага ўзроўню.

З імем Я.Храптовіча звязана ўзнікненне каштоўнага збору рукапісаў, старадрукаў і музейных калекцый у наваградскіх Шчорсах, а з імем гарадзенскага старасты А.Тызенгауза -- першых на Беларусі вышэйшых навучальных установ, балета, дзяржаўных мануфактур і "Газеты гарадзенскай". Тутэйшыя людзі, улюбёныя ў свой край, стварылі музеі і адзіны на Беларусі заапарк, якія і сёння працуюць.

Як выкарыстаць гэты магутны гісторыка-культурны патэнцыял, накіраваць на агульнанацыянальную справу адраджэння Беларусі, выхаванне нацыянальнай самасвядомасці яе народа і, найперш, маладога пакалення?

На Гарадзеншчыне пайшлі шляхам аб'яднання намаганняў мясцовай улады, вучоных Гродзенскага дзяржуніверсітэта, спецыялістаў, аматараў-краязнаўцаў, усіх зацікаўленых грамадскіх і дзяржаўных структур. Не канфрантацыя, не дарэмныя спрэчкі і ўзаемаабвінавачванні, а агульная рэальная справа аб'яднала шмат людзей.

Актыў Беларускага фонду культуры, краязнаўчага таварыства, аховы помнікаў гісторыі і культуры, прадстаўнікі дзяржаўных устаноў культуры і музеяў, дэпутатаў мясцовых Саветаў уключыліся ў працу па выкананні праграмы "Спадчына", якая набыла канкрэтныя формы ў выглядзе краязнаўчай асацыяцыі. Ажыццяўляецца мэтанакіраваная праграма "Наш радавод", вынікам якой сталі рэгіянальныя гісторыка-краязнаўчыя канферэнцыі ў шэрагу раёнаў, а "Навагрудскія чытанні" сталі ўжо традыцыяй гісторыка-краязнаўчага жыцця, якія прываблiваюць спецыялістаў і за межамі Беларусі. Мінулагоднія гісторыка-краязнаўчыя чытанні ў Лідзе, спалучаныя з нацыянальным святам незалежнасці Беларусі і адкрыццём агульнанацыянальнага помніка Ф.Скарыне, атрымалі міжнародны рэзананс. Шматлікія канферэнцыі і сімпозіумы адбыліся ў Гродне.

Асаблівую мэтанакіраванасць справа вывучэння і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны набыла пасля разгляду гэтага пытання на сесіі абласнога Савета ў 1992 годзе. Вось толькі некалькі прыярытэтаў, якія вызначыла ўлада:

-- распрацоўка канцэпцыі і стварэння мемарыялу нацыянальнага героя Беларусі К.Каліноўскага;

-- стварэнне да 200-годдзя з дня нараджэння А.Міцкевіча літаратурна-гістарычнага і культурна-асветніцкага комплексу;

-- вывучэнне, распрацоўка і адлюстраванне ў музейных экспазіцыях тэмы "Нацыянальная ідэя ў Заходняй Беларусі";

-- стварэнне нацыянальнага запаведніка "Гародня" на старажытнай частцы абласнога цэнтра;

-- арганізацыя нацыянальнага гісторыка-краязнаўчага фонду імя Я.Храптовіча.

Нягледзячы на цяжкія ўмовы сённяшняй рэчаіснасці, гэтыя рашэнні выконваюцца. На жаль, не хапае сродкаў, а галоўнае, дзелавой волі і паслядоўнасці ў некаторых адказных работнікаў. Цяжка зразумець аргументы тых, хто гаворыць, што "сёння не той час", "ёсць важнейшыя клопаты" і г.д. І тым не менш у вобласці не толькі не дапусцілі вялікіх страт, распаду творчых калектываў і груп, але і зрабілі новыя набыткі, у тым ліку і прафесійнага майстэрства. Трэцім прафесійным тэатральным калектывам вобласці стаў Слонімскі тэатр. Шырока вядомыя па-за яе межамі ансамблі Гродзенскага Дома культуры "Нёман", "Лідчанка", "Ніва" з Верцялішак...

Пасля перадачы гісторыка-краязнаўчаму музею будынка былога абкама партыі -- каралеўскага палаца XVIII стагоддзя -- новыя рысы набыло мастацкае і музейнае жыццё абласнога цэнтра. Тут арганізаваны шэраг выстаў, літаратурна-мастацкіх вечарын, працуе мастацкі аддзел музея, выстава "Выратаваныя каштоўнасці".

Першыя набыткі ў культурную скарбонку Прынёманскага краю зрабілі Саюз палякаў Беларусі, Міжнародны камітэт памяці А.Міцкевіча. Праблемы беларуска-польскіх культурна-гістарычных узаемаадносін тактоўна вырашаюцца шэрагам сустрэч "Шлях да ўзаемнасці".

Значнай з'явай культуры стала заснаванне гісторыка-культурнага часопіса "Свіцязь". Узніклі сучасныя гісторыка-краязнаўчыя і мемарыяльныя музеі ў Навагрудку, Гродна, Кушлянах.

Ёсць і астравы "зацішша" ў гэтай важнай дзяржаўнай і нацыянальнай справе. Як ні дзіўна, такія буйныя эканамічныя і гістарычныя цэнтры вобласці, як Слонім, Ваўкавыск, хаваюць ад гараджан сваю багатую даўніну: наведвальнікаў мясцовых музеяў сустракаюць экспазіцыі, убогія матэрыяльна і маральна.

Нямала помнікаў гісторыі і культуры разбурана, у тым ліку і ў астатнія гады. Дзяржаве і грамадству нанесены вялікія страты. І не толькі духоўныя. У жудасным стане Гальшанскі замак, авеяны легендарнай славай і ўспеты літаратурным талентам У.Караткевіча. "Герастратавай славай" надзялілі сябе кіраўнікі Гродзенскага райвыканкама, якія сваім рашэннем фактычна разбурылі дом-музей Я.Карскага.

І тым не меней рэзананс культурных ініцыятыў з Мінска, Гродна, шэрагу міжнародных арганізацый на Гарадзеншчыне станоўчы і выніковы. Нагадаем сустрэчы ў Мірскім замку, канферэнцыю "Рым-IV", чарговыя "Спатканні над Свіцяззю". У Астраўцы, як паведамлялася ў "Р", адкрыты помнік выдатнаму земляку -- Восіпу Гашкевічу, створаны фонд яго імя. Усё гэта выклікае вялікую зацікаўленасць землякоў, асабліва моладзі. І гэта, здаецца, галоўны вынік таго, што робіцца ў галіне вывучэння і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны.



Губляючы памяць, губляеш жыццё...

Рышард КАЦЫНЭЛЬ, старшыня Саюза палякаў Беларусі

ВЕЛЬМІ важны тэзіс, асабліва сёння, ў час цяжкага крызісу, калі, здавалася б, не да культуры, не да песні, не да гісторыі. Але як балюча памыляецца той, хто думае: трэба сёння накарміць людзей, ажывіць вытворчасць, а потым возьмемся за культуру! Але на гэта патрэбны дзесяцігоддзі, і пры занепадаючай культуры і маралі поспеху не дасягнеш.

І таму, мяркую, нам усім -- народу Беларусі, у тым ліку і палякам -- трэба неадкладна звярнуцца да вытокаў сваёй культуры і гісторыі і заняцца выхаваннем чалавека. Адсюль і задачы нашага саюза, і перш за ўсё культурна-асветніцкія. А нас толькі на Гродзеншчыне 300 тысяч -- болей чвэрці насельніцтва.

Пасля вайны знішчалася ўсё польскае: у 1948 годзе закрыта 40 школ, не засталося ніводнай газеты, інтэлігенцыя альбо вывозілася, альбо выехала сама. І трэба было ў 1988 годзе з пачаткам змены таталітарнага мыслення пачынаць з нуля і без кадраў. Але за апошнія гады з дапамогай прагрэсіўных улад на Гродзеншчыне зроблена ў гэтым кірунку нямала. Выходзяць штотыднёвая газета "Глос знад Немна", часопіс. Актыўна вывучаецца ў дзейнічаючых школах польская мова. Амаль у кожным згуртаванні палякаў дзейнічаюць гурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці, у Гродне чатыры ансамблі, з якіх адзін ужо народны. І хаця творчай інтэлігенцыі сярод тутэйшых палякаў амаль няма, аднак створаны свае сучасныя песні пра Гродна, Нёман... Працуюць згуртаванні мастакоў, навукоўцаў, ветэранаў, моладзі... Праводзяцца цікавыя сустрэчы, вечары. Дзейнічае Камітэт памяці А.Міцкевіча.

Дарэчы, памятаючы словы гэтага нашага вялікага паэта і земляка: "Народы, губляючы памяць, губляюць жыццё", наш саюз праводзіць значную працу па вяртанні памяці загінуўшых, адбудове могілак, эксгумацыі закінутых пахаванняў бязвінна расстраляных воінаў.

Трэба тут выказаць удзячнасць кіраўніцтву вобласці, асабліва Гродна, дзе прыхільна ставіліся і ставяцца да нашых патрэб.

Відавочна, што ў развіцці польскай меншасці зроблены добры задзел, але многае яшчэ трэба зрабіць.

Трэба і надалей будаваць і ствараць школы з польскай мовай навучання, стварыць сістэму асветы дзяцей, пабудаваць культурныя цэнтры, дапамагчы выхаваць сваю інтэлігенцыю, дапамагчы творчымі кадрамі. Як паветра, не хапае кваліфікаваных кадраў, арганізацыйная праца ажыццяўляецца ініцыятарамі на грамадскіх пачатках.

Да таго ж відавочна, што польская меншасць з'яўляецца своеасаблівай кладкай на сувязі Беларусі з Польшчай, а праз яе -- з Еўропай. Але важна на гэтай дарозе ўстрымацца ад палітыкі, якой павінны займацца толькі партыі. Мяне цешыць, што ўдалося пераканаць калег з кіраўніцтва нашага саюза не ўвязвацца ў выбарчую прэзідэнцкую кампанію. Мы павінны супрацоўнічаць з кожнай уладай.

Цешыць нас пазіцыя новай улады. Абяцанні былога прэм'ера аб будаўніцтве ў Гродне польскай школы і культурнага цэнтра ўжо, здаецца, прымаюцца новым Кабінетам міністраў, як эстафета. А словы першага Прэзідэнта аб тым, што свае школы павінны мець побач з беларусамі і рускія, і палякі, і ўсе другія народнасці, нас акрылілі. Дай Бог, каб словы не прапалі!

5

(Продолжение. Начало в N181.)

Должен также отметить, что после покушения на Гитлера в Мюнхене 9 ноября 1939 года охрана начала широко применять для подслушивания микрофоны, которые за несколько дней до прибытия Гитлера устанавливались между креслами в залах, где были намечены его выступления. Микрофоны изготавливались фирмой "Цейсс".

В поездках

Специальный поезд Гитлера состоял из 15 вагонов: вагон Гитлера, вагон имперского руководителя прессы, вагон с узлом связи, два салон-вагона, вагон-баня, два вагона для свиты и частей, два спальных вагона, два багажных вагона, вагон для охраны, две бронеплощадки с зенитными скорострельными артиллерийскими установками калибра 20 мм, связанные между собой телефоном.

Вагон Гитлера был довольно просторным. Начиная с 1942 года, Гитлер в нем обедал во время поездок, в то время как раньше он обычно ходил на обед в салон-вагон.

В вагоне, кроме купе Гитлера, имелись также отдельные купе для личного его адъютанта, для адъютанта вооруженных сил и для личного слуги -- штурмбанфюрера Линге.

Было учтено также особое пристрастие Гитлера часто принимать теплую ванну, для чего в его вагоне было оборудовано специальное помещение.

Одно купе в вагоне было оборудовано для него в виде небольшого служебного кабинета.

Вагон не был бронирован.

В 1944 году нами было запланировано устройство в вагоне бронированного купе для Гитлера, однако это мероприятие мы не успели провести.

Весь обслуживающий персонал, начиная с 1938 года, был постоянным и контролировался тайной полицией.

Все пассажиры, включая офицеров, были занесены на специальный учет имперской службы безопасности.

Так как состав сопровождающих лиц был почти всегда одним и тем же, эти задачи были значительно облегчены.

Подъездные пути и перрон строжайше охранялись службой безопасности и железнодорожной полицией.

Пассажиры сопровождались железнодорожной полицией к представителю РСД и последним -- к личному адъютанту Гитлера.

Багаж гостей из их домов в поезд доставлялся чинами батальона СС в присутствии пассажиров. Каждое место багажа было снабжено точным адресом владельца. Багаж, доставленный каким-либо иным путем, в вагон не допускался. Нахождение на перроне постороннего багажа и посторонних лиц строго запрещалось.

Продукты для спецпоезда доставлялись железнодорожной компанией "Митропа" в присутствии начальника салон-вагона СА гауптштурмфюрера Крюкена. Также под тщательным наблюдением происходила заправка водой.

Ремонт вагона производился только постоянным обслуживающим персоналом. В случае направления вагона для ремонта в депо все время при этом присутствовал комендант вагона. Для ремонта привлекались особо проверенные рабочие и инженеры.

Пустой поезд охранялся двумя сотрудниками РСД, 11 чиновниками железнодорожной полиции и 39 зенитчиками.

Маршрут держался в строжайшем секрете, причем составлялся таким образом, что нельзя было понять, когда Гитлер будет пользоваться поездом. Гостям приход Гитлера объявлялся примерно за час до этого. Зачастую Гитлер вместе с охраной входил или выходил из поезда с другого вокзала, нежели гости.

В ночное время все вагоны были заперты, за исключением вагона охраны. Железнодорожные станции были закрыты, чтобы посторонние лица туда не могли пройти.

Впереди спецпоезда на определенной дистанции двигался добавочный поезд.

Если поездки совершались официально и ожидались встречи публики, то железнодорожное начальство заранее заботилось о правильном размещении встречающих.

Если Гитлер находился в ставке, то поезд через неопределенные промежутки времени перемещался со станции на станцию. Поезд все время был в состоянии готовности, что налагало зимой особые трудности.

На автомашинах

Гитлер пользовался автомашинами только следующих типов: "мерседес-бенц", открытая, и лимузин с мотором мощностью в 150 лошадиных сил, а также вездеходом марки "штейер".

Все машины Гитлера были бронированы и снабжены специальными непробиваемыми стеклами.

Испытания, которые проводились периодически, показали, что броня выдерживала обстрел автоматического оружия, пулемета и не оставляла вмятин от взрыва гранат. Стекло выдерживало воздействие 7 винтовочных выстрелов в одну точку.

Эти технические показатели вполне отвечали требованиям безопасности,

6

так как трудно было рассчитывать на длительный обстрел во время поездки.

В отношении бронирования следует заметить, что броня прикрывала все стенки машины, включая днище. При закрытом варианте крыша также имела броневую защиту.

Фары-прожектора были исключительно сильные, так что ослепляли все встречные машины, исключая, таким образом, возможность обстрела со стороны последних.

Кроме того, в машине имелось несколько небольших, управляемых вручную сверхсильных фонарей, позволявших освещать все пространство вокруг машины. Сзади машины был также установлен сильный прожектор, при помощи которого можно было ослеплять все машины, пытавшиеся нагнать машину Гитлера.

Машины сопровождения /их обычно было две/ имели сзади светящуюся надпись: "Полиция, обгон запрещен". Таким образом, лица, пытавшиеся обогнать конвой, подлежали привлечению к уголовной ответственности. Однако в моей практике таких случаев не было.

Подножки в машинах закрывались вплотную дверями и исключали, таким образом, возможность впрыгивания на ходу посторонних лиц. Эта мера предосторожности была проведена нами после покушения на югославского короля Александра и французского министра иностранных дел Барту. Это покушение было заснято на пленку французской кинохроникой, и фильм был специально закуплен германским правительством для детального изучения. Я лично просматривал эту кинохронику несколько раз.

Внутри автомашин Гитлера имелись хорошо замаскированные и быстро открывающиеся кобуры для автома-



7

тов и пистолетов.

Автомобили охраны до 1941 года были вооружены каждая двумя пулеметами с 1200 патронами к каждому из них. С момента войны против Советского Союза автомобильная охрана во время поездок получала на вооружение также автоматы и "панцерфаусты".

Характерно, что Гитлер редко ездил со скоростью свыше 90 км в час, автомобильные поездки он любил, так как при этом отдыхал.

Следует различать поездки Гитлера секретные, когда это тщательно скрывалось от посторонних, и официальные, когда о поездке Гитлера население знало.

При секретных поездках Гитлера сопровождающим его лицам сообщалось лишь время отъезда, цель поездки была известна лишь Гитлеру.

Нередко в таких случаях, уже после выезда, Гитлер сам лично намечал маршрут на карте.

Во время секретных поездок Гитлера светящаяся надпись на машине сопровождения "Полиция, обгон запрещен" закрывалась специальным щитом.

Во время езды обгон колонны посторонними машинами не допускался. Автомашинам, пытавшимся обогнать колонну, загораживали путь автомобили сопровождения.

Все скопившиеся сзади посторонние автомашины на перекрестках пропускались вперед, чтобы сохранить в тайне маршрут Гитлера.

После 1935 года к автомашине приобрели прицеп, в который по воскресеньям нагружали продукты для поездок за город.

Во время привалов в стороне от дороги обычно выставляли два караульных поста.

Остановки совершались только в определенных гостиницах.

Если в виде исключения необходимо было остановиться в другом пункте, то вперед высылалась "квартирная команда" в составе двух чиновников РСД и адъютанта для заблаговременной подготовки квартиры.

Женщин в автомобильные поездки Гитлер не брал.

Особые охранные мероприятия надлежало произвести при официальных поездках, так как маршрут был известен за несколько дней и население собиралось для встречи Гитлера.

В таких случаях за несколько дней чиновниками криминальной полиции бралась под наблюдение вся трасса. Владельцам домов давалось указание ни в коем случае не допускать в дома неизвестных лиц. Все гаражи и автомастерские просматривались с целью обнаружения там посторонних машин.

Киоски и полые колонки для афиш брались под особое наблюдение.

Устройство громкоговорителей было разрешено лишь специальной команде штурмовиков. Вывешивание лозунгов, украшений и сооружение трибун осуществлялось под наблюдением сотрудников областного руководства НСДАП.

Для фоторепортеров и кинооператоров были отведены специальные места, за которыми велось тщательное наблюдение.

Если по пути нужно было проезжать парк, то в таком случае в нем всегда находились чиновники полиции с собаками.

В день митинга улицы охранялись военизированными соединениями НСДАП и полицией. Чтобы предотвратить бросанье цветов, их брали у публики и затем приносили к Гитлеру. Лиц с багажом с улиц немедленно удаляли.

Оцепление располагалось таким образом, что каждый второй охранник стоял лицом к публике, а чиновники полиции размещались среди публики и в задних рядах.

Особая осторожность была необходима на поворотах в связи с замедлением езды.

Все эти мероприятия были совершенно необходимы, так как Гитлер стоял в машине, которая ехала почти шагом. Письма передавались только охране, которая ехала на двух машинах вплотную к автомобилю Гитлера.

Следует также отметить, что Гитлер во всех случаях пользовался только своими личными автомашинами. Если ему приходилось ехать в поезде или лететь на самолете в другой город, то вся его автоколонна подтягивалась своим ходом к соответствующим пунктам.

В самолете

"Эскадрилья фюрера", также входившая в мое подчинение /как шефа РСД/, состояла из самолетов Гитлера, Гиммлера и Риббентропа.

Командиром эскадрильи являлся генерал-лейтенант Баур -- личный пилот Гитлера.

Самолет Гитлера -- четырехмоторный типа "Кондор", фирмы "Фокке-Вульф".

Его корабль и другие /Ю-52 и ХЕ-III/ стояли в ангарах, вход в которые разрешался только членам экипажей, имеющим специальные пропуска за подписью Баура. Ремонт или осмотр производился только в присутствии одного из членов экипажа. Охрану несли СС и полк "Великая Германия".

Вначале все корабли находились на одном аэродроме, но в связи с бомбардировками после 1941 года они были рассредоточены на разных аэродромах.

Пилотами являлись высококвалифицированные летчики, ранее служившие в "Люфтганзе". Каждый из них налетал не менее миллиона километров. Такими пилотами были: Баур, Дольди, Шнебеле, Бец, Гейн, Фридрих, Хюбнер и Гейзельбрехт.

Гейн потерпел аварию в декабре 1941

8

года на аэродроме гор.Орел, Шнебеле убили партизаны в 1942 году в окрестностях Житомира, Дольди был сбит русским истребителем в районе Лодзи в 1944 году.

Порядок с проверкой пассажиров и багажа был такой же, как и в специальном поезде.

В самолет Гитлера поступал только его личный багаж.

О летно-технических и пилотажных свойствах самолета Гитлера должен подробно рассказать находящийся в плену у русских личный пилот Гитлера -- СС группенфюрер Баур.

Мне лично о самолете Гитлера "Кондор" фирмы "Фокке-Вульф" известно следующее:

крейсерская скорость корабля равна 340 км в час, при продолжительности полета в 4 часа.

Потолок самолета мне не известен, во всяком случае, мы никогда не летали выше 4,5 тысячи метров, так как Гитлер плохо себя чувствовал на высоте.

Для высотных полетов в самолете для каждого пассажира имелся кислородный прибор.

"Кондор" Гитлера имел специальное устройство, позволяющее последнему в случае опасности путем нажима кнопки открывать перед собою в кабине люк, в результате вместе с сидением, на котором Гитлер был заранее укреплен ремнями, он мог вывалиться из самолета, после чего автоматически раскрывался парашют.

Это устройство, и особенно парашют, непрерывно подвергалось специальным проверкам.

Самолет имел на вооружении два сверхтяжелых пулемета калибра 150 мм, установленные один в хвосте, а другой под фюзеляжем.

Во время полетов на фронт самолет Гитлера сопровождался эскортом истребителей в количестве от 6 до 10 машин, пилотируемых надежными "асами".

Должен также сказать, что для Гитлера был подготовлен новый корабль, каковым являлся последний образец "Юнкерса" -- Ю-250, имевший на вооружении 9 скорострельных пушек калибра 20 мм.

(Продолжение следует.)


Наша реклама Ваш успех!
АВТООТВЕТЧИК 68-22-15
ТЕЛЕФОН 68-25-39 ФАКС 68-25-15
Б.Хмельницкого,10а к.633, 634

ПОД ЗАНАВЕС

ПОГОДА

Долгота дня -- 12.21
Полнолуние -- 19 сентября
Заход Луны -- 7.33
Восход -- 19.37

Сегодня днем по республике ожидается переменная облачность, по западной половине пройдут кратковременные дожди. Температура воздуха: Гродно -- от 21 до 23, Витебск, Минск -- от 18 до 20, Могилев -- от 21 до 23, Брест -- от 22 до 24, Гомель -- от 24 до 26 градусов тепла.

В последующие двое суток ожидается: 21-го в западных районах, 22-го местами по республике кратковременные дожди, возможны грозы. Температура воздуха: ночью -- от 10 до 15, днем 21-го -- от 21 до 26, 22-го -- от 17 до 22 градусов тепла.

СПОРТ

Гасцінныя гаспадары і медалі аддалі

На маляўнічым стадыёне ў Маладзечне адбыўся першы чэмпіянат Еўропы па гарадках. Гаспадары зрабілі ўсё, каб госці адчувалі сябе добра. А прыехалі сюды прадстаўнікі Расіі і Украіны.

Для гледачоў таксама было ўсё -- і напружаная барацьба, і драматычныя сітуацыі, і рэкорды. Хіба толькі іх гаспадары падвялі -- дзве зборныя Беларусі, аснову якіх складалі маладзечанцы, засталіся без медалёў.

У камандных спаборніцтвах перамогу святкаваў першы калектыў Расіі, які апярэдзіў зборныя Расіі-2 і Украіны. Лепшыя асабістыя вынікі паказалі расіяне В. Духанін і М. Нікіцін, украінец Аляксандр Бабіч.

Уладзімір АБРАМОВІЧ

"Серебряные" руки

В шведском городе Седертелье завершился чемпионат мира по армреслингу (борьбе рук), в котором участвовало более тридцати стран. Успешно выступили белорусские спортсмены Елена Кондратова и Владимир Никольский -- в своих весовых категориях они завоевали серебряные медали.

НУ И НУ!

Закусывают и шляпой, и кактусом...

Недавно в одну из больниц Санкт-Петербурга попал бомж. Во время совместного распития спиртных напитков он на спор съел собственную шляпу. Немного ранее другое лицо той же категории попало в больницу, съев мексиканский кактус.

Михаил КАРЧИК

УЛЫБКИ ИЗ КОНВЕРТОВ

Мне однажды сказали, что нельзя объять необъятное, а я почему-то все обнимаю и обнимаю.

* * *

Она -- белоруска, родилась и всю жизнь прожила в Минске. Почему же ее дети должны быть кавказской национальности?

* * *

В настоящее время без войны и стихийных бедствий идет постепенно-медленное удушение вкладчиков.

* * *

Я не ставлю Президента на один уровень с Богом: это совершенно разные товарищи.

* * *

Я всю жизнь скрывала, что муж гуляет. Но сын все-таки пошел по стопам отца.

КОНКУРС



В Москве на Белорусском вокзале бабка впервые увидела живого негра и спрашивает, кто же это такой?

-- Солженицын, -- с видом знатока сообщает ей дед.

-- Божечки! -- восклицает бабка. -- До чего человека очернили...

В.ЗУБАРЬ

Ляховичи

АНОНС

Завтра в "Р":

- **"Военные генералы имеют в своем распоряжении 500000 гектаров белорусской земли. Вся она им совершенно не нужна, однако передавать в народное хозяйство не хотят. И все-таки с лишней землей придется расстаться: по решению руководства республики проводится инвентаризация земель Министерства обороны. Как это делается?"**